богатым материалом, расширяющим наше представление об отечественной истории и культуре.

Литература
1. Рафеева, М. С. Книжное наследие Гомельщины / М. С. Рафеева // II Международные Паскевичские чтения в Гомеле : материалы науч.-практ. конф., Гомель, 23−24 сент. 2021. − Минск, 2021. − 273 с.
2. Шкель, А. О. Пережившие века: соотнесение имеющегося фонда Паскевичей с Описью имущества Паскевичей 1903 года / А. О. Шкель // II Международные Паскевичские чтения в Гомеле : материалы науч.-практ. конф., Минск, 23–24 сент. 2021 г. / М-во финансов Респ. Беларусь. − Минск, 2021. − 273 с.
3. Кунин, В. В. Библиофилы пушкинской поры / В. В. Кунин. – М. : Книга, 1979. – 352 с.

УДК 821.161.3-31*І.П.Шамякін

# ПСІХАЛАГІЧНЫ КАНФЛІКТ У ПОЗНІХ АПОВЕСЦЯХ І. ШАМЯКІНА: АДЗІНОТА І СТАРАСЦЬ

**К. В. Уніятава**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны», Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік А. В. Брадзіхіна

*У артыкуле на матэрыяле аповесцей І. Шамякіна «Пошукі прытулку» і «Стары рамантык» разгледжаны спосабы вырашэння творцам псіхалагічнага канфлікту. Асаблівая ўвага нададзена асэнсаванню вобразаў герояў і катэгорыям «адзінота» і «старасць». Адзначаны арыгінальныя падыходы пісьменніка да ўвасаблення гэтага літаратурнага тыпу.*

**Ключавыя словы:** псіхалагічны канфлікт, герой, аповесць, катэгорыя адзіноты, літаратурны тып.

# PSYCHOLOGICAL CONFLICT IN THE LATE STORIES OF I. SHAMYAKIN: LONELINESS AND OLD AGE

**K. V. Uniyatava**

*Francysk Skaryna Homiel State University, the Republic of Belarus*

Science supervisor A. V. Bradzikhina

*The article on the material of I. Shamyakin's stories "Search for asylum" and "Old Romantic" discusses ways to resolve the psychological conflict. Particular attention is paid to comprehending the images of the characters and the categories of "Loneliness" and "Old age". The writer's original approaches to the embodiment of this literary type are noted.*

**Keywords:** psychological conflict, character, story, categories of «Loneliness», literary type.

Іван Пятровіч Шамякін 31 снежня 1990 г. зрабіў такі запіс: «Непрыкметна перайшоў на час сённяшні, калі ўсё, чаму маліліся, рушыцца. Пачынае палохаць, што шмат хто гэты развал гаспадаркі краіны прымае як натуральны працэс. Мой сябра Пятро Васілеўскі нават з гумарам. Яму можна пазайздросціць: і ў свае 68 гадоў ён не пазбавіўся гумару» [1, с. 225]. Асэнсаванне хаосу і катастрафічнасці быцця адчувальнае ўжо ў творах пісьменніка «Сатанінскі тур», «Без пакаяння», «Крывінка”, «Paradies auf Erden», «Падзенне» і інш. Пачынаючы з другой паловы 1990-х гг., усё

часцей да такога ўспрымання І. Шамякіным навакольнай рэчаіснасці далучаліся суб'ектыўна-асабістыя адчуванні няўхільнага поступу старасці, што выявілася найперш праз узнікненне ў яго празаічных тэкстах адмысловага героя. В. Караткевіч слушна заўважае: «Ва ўсіх апошніх з названых твораў дзейнічае дастаткова цікавы тып літаратурнага героя – homo solitarius (чалавек адзінокі)» [2].

Найбольш выразна такі літаратурны тып праступае ў аповесцях «Пошукі прытулку» і «Стары рамантык». Гэта наіўны, трохі смешнаваты, немалады мужчына, які шукае сабе не столькі фізічнага, колькі душэўнага прытулку ў варожым і чужым акаляючым свеце, сярод незразумелых яму ідэй і людзей. Адзінота ў аповесцях І. Шамякіна мае самыя розныя праявы, у кожнага з герояў яна мае ўласнае аблічча.

Стары прафесар, былы дырэктар інстытута, Ігнат Андрэевіч Мятніцкі з аповесці «Пошукі прытулку» жыве ў адной кватэры разам з сынам, нявесткай і іх маленькай дачкой Светкай. Усё, што цікавіць героя, – гэта мінулае: згадкі пра памерлую жонку і іх каханне, пра ранейшую працу, якая давала яму важкі статус у грамадстве і павагу. Думае Ігнат Андрэевіч і пра смерць. Змешванне рэальнага і ўяўнага ў творы адбываецца праз матыў сну. Менавіта прастора сну становіцца для героя сапраўднай рэальнасцю, дзе можна быць шчырым і бясстрашным, дзе самыя смелыя фантазіі могуць рэалізоўвацца, дзе ён зноў вяртаецца ў маладосць. У сне Ігнат Андрэевіч бачыў сваю ненапісаную кнігу «Ідэі Льва Талстога аб зямлі», разважаў пра будучыню калектыўнай гаспадаркі, пра стан сучаснага яму грамадства, якое загубіла ідэі камунізму. Высновы і роздумы пасля такіх начных мрояў наведвалі яго несуцяшальныя.

Але насамрэч песімізм героя абумоўлены пачуццём адзіноты, бо няма ў Ігната Андрэевіча паразумення з сынам і з яго сям'ёй, былыя калегі нават не згадваюць яго, а старому проста не хапае ўвагі: «Праўда, пра юбілей гэты ўспомнілі інстытут. Наладзілі ў зале ўрачыстае паседжанне. Пасля, праўда, забылі – ніводнага званка з інтытута. Заходзіў разы два – не знайшоў з кім пагаварыць: усе новыя і ўсе лічаць сябе супервучонымі» [3, с. 22].

Думаючы пра смерць і сваё самотнае існаванне, Ігнат Андрэевіч усё ж такі жадае жыць. Але жыць, як у сваім мінулым, – самадастатковай і паважанай асобай. Гледзячы на маладых, якія хочуць самастойнасці і незалежнасці, ён мімаволі перакладвае на іх віну за сваю незапатрабаванасць і адзіноту: «Недарэмна ж, змясціўшы з дырэктара ў шэсцьдзясят пяць, яго да сямідзесяці двух трымалі на сектары бульбаводства. І з яго думкай лічыліся – у навуковых колах, у міністэрстве, на ўрадзе. Лічыліся… А за пяць гадоў пенсіянерства забыліся, што не вельмі даўно быў такі нацыянальны вучоны. Праўда, за гэтыя гады свет перавярнуўся дагары нагамі, усё, што стваралася дзесяцігоддзямі, развалілі маладыя «рэфарматары». Але што далі рэформы гэтаму народу?» [3, с. 3].

Ад гэтага «новага», перакуленага, дысгарманічнага свету стары спрабуе ўцячы з дому то ў госці да сваёй дачкі ад першага шлюбу, то на вулічны шпацыр. Але назіранне за сямейным шчасцем дачкі ці непасрэднасцю паводзін сустрэтай на вуліцы путаны толькі ўзмацняе пачуццё адзіноты Ігната Андрэевіча. Не дапамагае і рашэнне вярнуцца да першай жонкі ў вёску, да простага ціхамірнага жыцця на ўлонні прыроды. Там усё адно паступова, але няўхільна героя напаўняе вострае адчуванне ўласнай самотнасці, бо прыходзіць усведамленне штучнасці вяртання ў шчаслівае мінулае. Адзінота Ігната Андрэевіча мае разбуральны характар і не пакідае герою шансаў на шчаслівую старасць, на магчымыя змены ў жыцці.

Падобны персанаж выведзены пісьменнікам у аповесці «Стары рамантык». Доктара гістарычных навук, прафесара Івана Піліпавіча Шчура чытач упершыню сустракае, калі той эмацыйна чытае рукапіс сваіх вучняў: «Ставіў яркія клічнікі, ра-

дуючыся за ўдачу аўтара. Намнога часцей і злосна ставіў пытальнікі, якія вызначалі розныя адценні незадаволенасці рэцэнзента аўтарскім тэкстам, часам зместам, канцэпцыяй, часта стылем, выразнасцю думкі. Пісаў рэцэнзію – у галаве. Не злую, але ўедлівую – каб насаліць сваім былым вучням, якія зусім забыліся на тое, чаму ён вучыў іх» [3, с. 141]. Матыў незапатрабаванасці і пакінутасці, пошукаў вінаватых у адзіноце старога чалавека плаўна перацякае ў незадаволенасць героем навакольнай рэчаіснасцю, акаляючым грамадствам: «Больш за паўстагоддзе ён [Іван Шчур. – У. К.] лічыў, што яго навука – гісторыя – па дакладнасці і «вучоным кансерватызме» набліжаецца да матэматыкі. Так было да… Да вялікага развалу. Развалілі дзяржаву, аплявалі тэарэтыкаў сацыялізму, аднаго Ісуса не зачапілі, першага сацыяліста. І пачалі пісаць новую гісторыю» [3, с. 142].

Відавочная і сюжэтная блізкасць аповесцей «Стары рамантык» і «Пошукі прытулку», але герой першай з іх выведзены не як драматычны персанаж, а як трагікамічны, што адпаведным чынам вызначана ўжо самім аўтарам у жанравым падзагалоўку – трагікамічная аповесць. У Івана Піліпавіча, у адрозненне ад Ігната Андрэевіча, ёсць лад і ўзаемапаразуменне з сям'ёй і сябрамі. Нельга сказаць, што герою не хапае ўвагі і любові ад блізкіх людзей. Таму яго псіхалагічныя праблемы, якія выліліся ў пошукі былой завочнай закаханасці Леанілы з мэтай вярнуць адчуванні, перажытыя ў маладосці, выклікаюць хутчэй усмешку, чым спачуванне ў чытача. Эфект узмацняецца ў эпізодзе сустрэчы былых закаханых, якая даволі хутка набывае камічнае адценне, бо кабета пачынае раздражняць «старога рамантыка». Іван Піліпавіч расчараваны, бо замест маладой прывабнай жанчыны бачыць старую і нямоглую бабулю. Пры гэтым сам герой выглядае падобным да сваёй пасіі чынам. Да таго ж пісьменнік падрабязна апісвае хранічныя хваробы і фізіялагічныя праблемы героя: «Іван убачыў яе, ахапіў хуткім поглядам адразу ўсю – з галавы да ног… І адчуў патрэбу горка засмяяцца; так з іншых не смяюцца, так смяюцца толькі з сябе, калі зробіш несусветнае глупства. Перад ім стаяла сухенькая бабуля, шэра-белыя, што першы іней на дрэвах, валасы яе былі неахайна ўскудлачаны – не прычасалася яшчэ, прыгладзіла іх маленькай рукой. Стары бруднаваты татарскі халат да самых пят. Вочкі вузкія, як бы прыжмураныя ад святла. Толькі нос і вушы пазнаў па фатаграфіях» [3, с. 174].

Такім чынам, у аповесцях «Стары рамантык» і «Пошукі прытулку» І. Шамякін паказаў розныя праявы шляхоў пераадолення адзіноты ў старасці як праяў унутранага псіхалагічнага канфлікту асобы. У абодвух творах выведзены вобразы маленькіх, былых вялікіх, людзей – homo solitarius (чалавека адзінокага). Пры гэтым пісьменнік падкрэслівае, што знешнія спробы герояў пераадолець самоту, звязаныя з захаваннем камунікацыйных сувязяў са знешнім светам ці вяртаннем у маладосць, беспаспяховыя. Больш важна ўстанавіць гарманічныя адносіны з самім сабой, чым з іншымі людзьмі. Менавіта ўнутраная дысгармонія прыводзіць чалавека да канфлікту з акаляючым светам.

Літаратура

1. Шамякін, І. Роздум на апошнім перагоне: Дзённікі 1980–1995 гадоў / І Шамякін. – Мінск : Мастац. літ., 1998. – 527 с.
2. Караткевіч, В. Ці будуць плёнными пошукі прытулку? / В. Караткевіч. – Рэжым доступу: https://libr.msu.by/bitstream/123456789/3980/1/2884m.pdf. – Дата доступу: 10.03.2023.
3. Шамякін, І. П. Збор твораў : у 23 т. / І. Шамякін ; падрыхт. тэкстаў і камент. В. Карачун ; пасьляслоў. В. Караткевіча ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Мастац. літ., 2012. – Т. 8: Аповесці, п'есы 1999–2000. – 655 с.